УДК 378.172.1

В. А. Кузьміч, заг. кафедры

# АСНОЎНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫХАВАННЯ ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ І ПАТРЫЯТЫЗМУ НА КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

This article deals with the basic approaches to the civil and patriotic upbringing realized by the Belarusian language department of BTSU. The article illustrates how to optimize to organize better upbringing activity in a high school. An experience of Belarusian language department in this field is presented and some useful advises are given here.

Прыярытэтным напрамкам выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі застаецца грамадзянска-патрыятычнае і ідэйна-маральнае выхаванне студэнцкай моладзі. Задача педагогаў – выхаванне грамадзяніна-гаспадара на сваёй зямлі, запатрабаванага ва ўласнай краіне, адказнага за яе лёс, развіццё і росквіт. Як ніколі, актуальна ўспрымаюцца простыя, на першы погляд, радкі нашага суайчынніка Адама Міцкевіча: «Наш самы высокі набытак – Айчына, навука, сумленне», якія якраз і выяўляюць сутнасць грамадзянскасці і патрыятызму. Грамадзянскасць грунтуецца на практычным ажыццяўленні моладдзю сваіх правоў і абавязкаў перад дзяржавай. Асновай грамадзянскасці з'яўляецца патрыятызм як любоў да Радзімы і адказнасць за яе лёс.

Сацыяльна значныя дзяржаўныя праграмы «Моладзь Беларусі», «Маладыя таленты Беларусі», «Дзеці Беларусі», зацверджаныя Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэальна скіроўваюць нашу моладзь на вырашэнне такіх задач, як павышэнне адукацыйнага ўзроўню, гатоўнасць да працы, патрыятычнае выхаванне, фарміраванне здаровага ладу жыцця і інш. Багатая нарматыўная база, якую мае кожная навучальная ўстанова, дае магчымасць кафедрам арганічна спалучаць навучанне і выхаванне. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывае якаснае планаванне выхаваўчай працы. Распрацаваная кафедрай разгорнутая праграма ідэалагічнай і ідэйна-выхаваўчай працы ўлічвае не толькі асноўныя напрамкі выхаваўчай працы, але і разнастайныя формы яе практычнага ажыццяўлення: гутаркі, дыскусіі, круглыя сталы, прафесійна арыентаваныя сустрэчы з дзяржаўнымі дзеячамі, дэпутатамі, работнікамі органаў правапарадку, пісьменнікамі, навукоўцамі; музейныя заняткі, экскурсіі, падарожжы, культпаходы і г. д. Пры складанні праграмы выхавання ўлічваюцца пажаданні студэнтаў, якія на працягу навучальнага года вывучаюцца і сістэматызуюцца.

Планаванне мерапрыемстваў павінна выключаць фармалізм, абапірацца на здаровы сэнс і прыносіць канкрэтныя практычныя вынікі.

Фарміраванне патрыятызму – гэта не проста выхаванне любві да Радзімы, гэта захаванне і прымнажэнне тых каштоўнасцей, якімі любы цывілізаваны народ мае права ганарыцца: найперш, мова, гісторыя, культура.

У беларускай мове, як і ў іншых мовах народаў свету, адлюстравана адзіная самабытная і непаўторная карціна бачання свету. Беларускі народ у сваёй мове, міфалогіі, вуснапаэтычнай творчасці, літаратуры, мастацтве выказаў і пакінуў нашчадкам разуменне высакароднага, каштоўнага і прыгожага. Родную мову, як і родную зямлю, гісторыю народа, нацыянальную культуру, веру, святыні, вучоныя ўключаюць у сістэму асноўных духоўных каштоўнасцей. Мова сёння – гэта не толькі вучэбны прадмет, але і сродак выхавання. Кафедра беларускай мовы напоўніла выкладанне дысцыпліны ідэалагічным зместам. Уключэнне тэм вуснага маўлення ў экзаменацыйныя білеты (напрыклад: «Герб, гімн і сцяг Беларусі – галоўныя сімвалы дзяржаўнасці», «Беларусь на карце свету», «Дзеячы беларускай навукі», «Святы і абрады беларусаў», «Нацыянальны характар і менталітэт беларусаў», «Гераічная Беларусь» і інш.) дае магчымасць удасканальваць маўленчую культуру студэнтаў і выхоўваць грамадзянскасць і патрыятызм. Моўная культура – паказчык духоўнасці асобы. Згадаем словы Ф. Багушэвіча: «Мова – адзежа душы». Мова ў дзеянні – у гэтым сутнасць асобасна арыентаванага навучання, таму кафедра беларускай мовы праз мову і дзякуючы ёй удасканальвае змест выхавання, напаўняючы яго сучаснымі формамі. Адной з іх з'яўляецца правядзенне студэнцкіх навукова-практычных канферэнцый. Толькі за 2006–2007 гг. праведзена 18 канферэнцый (напрыклад: «Патрыёты Бацькаўшчыны», «Беларусь – мая Радзіма», «Мой край – мае карані», «Ніхто не забыты, нішто не забыта», «Квітней, край родны, край прыгожы», «Скарбы спадчыны духоўнай», «Назвы роднай зямлі», «Твой гонар, Бацькаўшчына», «Янка Купала – вялікі нацыянальны паэт» і інш.), якія сведчаць пра высокі патрыятызм студэнцкай моладзі, іх жаданне бачыць наш край ва ўсёй шматграннасці.

Магутным фактарам выхавання грамадзянскасці і патрыятызму, якія ўяўляюць арганічную частку ідэалагічнага і ідэйна-патрыятычнага выхавання, з'яўляецца студэнцкае аб'яднанне «Пошук», у склад якога ўвайшлі наступныя студэнцкія гурткі: «Спадчына», «Выток», «Крыніца», «Мая Радзіма – Беларусь», «Патрыёт», «Пазнай свой край», «Памяць».

Вядучае месца ў выхаванні любві да сваёй вялікай і малой радзімы, фарміраванні грамадзянскасці і патрыятызму займаюць краязнаўчыя гурткі «Пазнай свой край» і «Мая Радзіма – Беларусь» (кіраўнікі – ст. выкладчык Г. В. Казлоўская і выкладчык Т. В. Жукоўская). Падрыхтоўка тэматычных творчых праектаў, даследаванняў малой радзімы студэнтаў, экскурсіі і падарожжы, стварэнне відэафільмаў, экспазіцый – далёка не поўны пералік мерапрыемстваў, праведзеных гэтымі гурткамі. У рэчышчы рэспубліканскай акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» за 2005–2007 гг. арганізавана 24 экскурсіі па Беларусі (Полацк, Тураў, Глыбокае, Жыровічы, Мікалаеўшчына, Хатынь, Курган Славы і інш.). Да выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь было наладжана для лепшых студэнтаў падарожжа з вялікай канцэртнай праграмай на малую радзіму Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (Мінск – Шклоў – Александрыя). Выступленні перад сельскімі жыхарамі, вучнямі, ускладанне кветак да помнікаў героям Шклоўшчыны, азнаямленне з гістарычнымі помнікамі – усё гэта выхоўвае ў студэнтаў здаровы патрыятызм. Мэтай гуртка «Памяць» з'яўляецца фарміраванне пачуцця любві і павагі да сваёй Радзімы, гонару за яе мінулае і сучаснае. Вывучэнне ваеннага мінулага сваіх дзядоў і прадзедаў, праца ў архівах, напісанне радаводаў, творчых даследаванняў, падрыхтоўка відэафільмаў, удзел у рэспубліканскіх і міжнародных выставах – вось толькі некаторыя напрамкі дзейнасці гуртка. Далучэннем студэнтаў да літаратурнай спадчыны нашага народа – галоўная мэта дзейнасці гуртка «Спадчына» (кіраўнік – канд. філал. навук, дацэнт Т. М. Федарцова). Нетрадыцыйная форма працы гуртка з запрашэннем пісьменнікаў, навукоўцаў, наладжванне тэматычных выстаў да юбілейных дат, распрацоўка навуковых тэм – усё гэта скіравана на выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму.

Па выніках дзейнасці гурткоў рыхтуюцца навуковыя працы студэнтаў, якія прадстаўляюцца на рэспубліканскі конкурс па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. Пачынаючы з 2000 г., за ўдзел у згаданым конкурсе 6 студэнтаў і 3 аспіранты атрымалі Дыпломы I ступені Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (Г. І. Казлоўская «Асаблівасці беларускага вяселля», А. С. Адамовіч «Подзвіг народа бессмяротны», І. І. Радаман «Экалагічная праблематыка: погляд у мінулае», А. В. Пісарэвіч «Легенды і паданні Навагрудчыны», Т. А. Мялешка «Асаблівасці традыцыйнай вясельнай абраднасці беларусаў на Гродзеншчыне (XIX–XX стст.)» і інш.). За 2000–2006 гг. 42 студэнцкія навуковыя працы, падрыхтаваныя на кафедры беларускай мовы, адзначаны II–III катэгорыямі. Званне лаўрэата прэміі Мінгарвыканкама атрымалі студэнткі Г. І. Казлоўская і В. А. Бычкоўская. Тэматыка студэнцкіх прац суадносіцца з актуальнымі для дзяржавы праблемамі (напрыклад: В. А. Бычкоўская «Сацыяльная палітыка: мінулае і сучаснае»; Д. В. Чарнушэвіч «Цяжарная жанчына ў традыцыйнай культуры Беларусі»; Ю. П. Камінская «Тэма Чарнобыля ў беларускай паэзіі»; А. Ю. Бункевіч «Папяровыя фабрыкі Беларусі»; Г. І. Казлоўская «Этнакультурная спадчына беларусаў як ідэйна-выхаваўчы стрыжань адукацыйнага працэсу»; В. М. Цыганок «Фальклор Вялікай Айчыннай вайны»; Н. В. Мандрыкава «Мастацка-вобразны свет Чэрвеньшчыны» і інш.), якія маюць усебаковы выхаваўчы характар.

Выхаванню пачуцця патрыятызму, павагі да сваёй Радзімы, гордасці за яе дасягненні садзейнічаюць такія формы правядзення вучэбна-выхаваўчай працы, як музейныя заняткі (толькі за 2005–2007 гг. арганізавана звыш 200 наведванняў музеяў і выстаў Мінска).

Сапраўдны патрыятызм пачынаецца з павагі і любві да свайго дома, школы, універсітэта, дзе навучаешся, таму з мэтай прапаганды дасягненняў БДТУ у сацыяльна-эканамічным развіцці краіны працуе гурток «Патрыёт». Праведзены шэраг прафарыентацыйных мерапрыемстваў у школах, гімназіях, ліцэях не толькі Мінска, але і ў іншых рэгіёнах Беларусі (вёска Зазерка Пухавіцкага раёна, сярэдняя школа № 2 Нясвіжа, школы і гімназіі Смаргоні, Пастаў, Шклова, Стоўбцаў, Турава і інш.). Падрыхтавана лектарская студэнцкая група для правядзення экскурсій у музеі БДТУ, у тым ліку і з мэтай прафарыентацыі (праведзена каля 20 экскурсій).

Стала добрай традыцыяй штогод праводзіць фестываль нацыянальных супольнасцяў Беларусі «Зямлі адзінай людзі», дзе прадстаўнікі іншых народаў дэманструюць не толькі сваю ўласную адданасць роднай зямлі, але і глыбокую павагу да беларускай мовы, гісторыі і культуры.

З мэтай грамадзянска-патрыятычнага і ідэйна-маральнага выхавання студэнтаў, развіцця іх літаратурных здольнасцяў актыўна дзейнічае літаратурны клуб «Ветліца» (у склад яго ўваходзіць звыш 100 студэнтаў, выкладчыкаў). Выдадзены 4 выпускі літаратурнага альманаха «AVE». Удзельнікі клуба сумесна са спеўным гуртом выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДТУ «Акавіта» праводзілі дабрачынныя канцэрты з беларускай праграмай для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, інвалідаў па зроку, а таксама на ўстановах адукацыі Мінска і іншых рэгіёнаў (Шклоў, Тураў, Нясвіж, Смаргонь, Пастаны, Стоўбцы, Мікалаеўшчына і г. д.).

Вынікам шматбаковай мэтанакіраванай працы кафедры стаў яе ўдзел у рэспубліканскіх выставах навукова-метадычнай літаратуры. За

прадстаўленую экспазіцыю навуковых і творчых прац на беларускай мове БДТУ быў адзначаны Дыпломам I ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за сістэмны падыход да распрацоўкі ідэалагічнага суправаджэння выхаваўчага працэсу (2005 г.); Дыпломам I ступені за патрыятычнае выхаванне студэнтаў з выкарыстаннем матэрыялаў аб ратным і працоўным подзвігу беларусаў, прысвечаных 60-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (2005 г.); Дыпломам I ступені за фарміраванне здаровага ладу жыцця навучэнцаў і студэнтаў (2006 г.); Дыпломам I ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму ў навучэнскай моладзі (2007 г.). Акрамя таго, кафедрай беларускай мовы былі прадстаўлены матэрыялы на міжнародную выставу, прысвечаную міжнароднай сустрэчы партызан, падпольшчыкаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і прадстаўнікоў Сусветнай федэрацыі ветэранаў вайны; на універсітэцкія выставы («Да 60-годдзя Перамогі», «За квітнеючую Беларусь», «Да 75-годдзя БДТУ» – усяго 705 экспанатаў).

Удзел студэнтаў у алімпіядзе па рускай мове, праведзенай па ініцыятыве Міністэрстваў адукацыі Расіі і Беларусі, засведчыў не толькі якасць ведання прадмета, але і высокі паказчык узроўню міжнацыянальных адносін. Студэнты факультэта выдавецкай справы і паліграфіі БДТУ атрымалі у першым туры (Мінск) дзесяць месцаў, у другім (Магілёў) – 1, 2, 3-е месцы і каштоўныя падарункі. Ці ж гэта не прыклад грамадзянскасці як канкрэтнага практычнага ўвасаблення вынікаў навучання?!

Прыведзеная інфармацыя красамоўна сведчыць пра тую ролю, якую адыгрывае беларуская мова не толькі ў якасці вучэбнага прадмета, але і дзейснага сродку ідэалагічнай і ідэйна-выхаваўчай работы. Як засведчыў сваёй працай выкладчыцкі калектыў кафедры беларускай мовы, выкладанне прадметаў гуманітарнага цыкла можна арганічна спалучаць з важнымі задачамі дзяржавы па ідэалагічным і ідэйна-патрыятычным выхаванні. Рэальнае практычнае напаўненне выхаваўчай працы будзе спрыяць выхаванню ў студэнцкай моладзі грамадзянскасці і патрыятызму.